ПАДЗЕЯ

# НЕ З ГРАНІТУ І БРОНЗЫ, А З ПАЭЗІІ, ПРОЗЫ

**28 лютага ў Дзяржаўнай установе адукацыі «Гімназія № 5 імя У. С. Караткевіча г. Гродна» адбылася чарговая прэзентацыя кнігі «Памяці вечны агонь» (2024), зборніка літаратурна-мастацкіх твораў, прысвечаных 80-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

Нагадаем, што стартаваў цыкл грамадскіх прэзентацый новага літаратурна-асветніцкага праекта Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі і Гродзенскага гарадскога савета ветэранаў 7 лютага ў Гродзенскай гарадской гімназіі імя А. І. Дубко. Як бачым, і зноў установа адукацыі, і зноў маладзёжная аўдыторыя. Расповеды пра жахі вайны, тэматыка бяспрыкладнай доблесці і мужнасці народа-вызваліцеля маюць першараднае значэнне менавіта ў асяроддзі моладзі, свядомасць якой часта ўспрымае гістарычную праўду недастаткова аб'ектыўна альбо нават скептычна. Каб пераадолець перашкоды на шляху да сэрцаў юнакоў і дзяўчат горада над Нёманам, нашай пісьменніцкай арганізацыяй не першы год рэалізуецца цэлы шэраг праектаў, сярод якіх грамадска-літаратурныя акцыі «Слова яднання» і «Пад мірным небам Беларусі», цыкл літаратурных урокаў мужнасці «Вечнай памяці слова» і многія іншыя. Каб умацаваць сувязь пакаленняў, на дапамогу прыходзіць мастацкая літаратура з яе яркімі вобразамі і захапляльнымі сюжэтамі. Пісьменнікі Прынёманскага краю добра разумеюць, што заваяваць увагу маладых людзей можна толькі шчырасцю і непасрэднасцю мастацкага матэрыялу, свежасцю і нетрывіяльнасцю творчых рашэнняў, пераканаўчай сілай думкі, майстэрскім выбарам мастацкіх сродкаў. Гаварыць пра Вялікую Айчынную вайну, пра высокую цану мірнага жыцця, звяртацца з гэтай тэматыкай да сучаснікаў са старонак кніг – грамадзянскі абавязак кожнага аўтара. Тым больш сёння, калі глабальны мір літаральна вісіць на валаску, калі нашы праціўнікі бесцырымонна перакройваюць гісторыю ва ўгоду ўласным інтарэсам, зносяць помнікі пераможцам фашызму… У Беларусі подзвіг савецкага салдата будуць памятаць і шанаваць заўсёды. Невыпадкова наша кніга атрымала назву «Памяці вечны агонь» і сама ўяўляе сабой помнік. Толькі не з граніту і бронзы, а з паэзіі і прозы.



У прэзентацыі кнігі ўзялі ўдзел: старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэса Людміла Антонаўна Кебіч; намеснік старшыні, паэт, публіцыст, літаратурны крытык Дзмітрый Радзівончык; член СПБ, паэтэса Кацярына Каламійцава; член СПБ, празаік Ірына Фамянкова; гродзенская паэтэса, перакладчык Антаніна Нурэтдзінава; члены Гродзенскага гарадскога літаратурнага аб'яднання «Надзея»: паэтэса Таццяна Лугавая і празаік Ірына Салата. Прэзентацыі кнігі папярэднічала ўрачыстае адкрыццё мемарыяльнага стэнда, прысвечанага сувязі пакаленняў і памяці пра ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны ад праўнукаў і ўнукаў, навучэнцаў і супрацоўнікаў гімназіі.

У актавай зале дзяржаўнай установы адукацыі, якая з гонарам носіць імя народнага пісьменніка Беларусі Уладзіміра Караткевіча, на сустрэчу з літаратурным дэсантам сабраліся вучні старшых класаў і педагогі. Людміла Антонаўна Кебіч адкрыла сустрэчу кароткім расказам пра зборнік, яго ідэю, яго змест і аўтараў. Затым па чарзе з уласнымі творамі перад моладдзю выступілі аўтары-удзельнікі калектыўнага літаратурнага праекта, які, дарэчы, не губляе сваёй актуальнасці і напярэдадні святкавання Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Праграму выступленняў склалі ваенна-патрыятычная паэзія, проза і публіцыстыка. Агучаныя аўтарамі творы сустрэлі зацікаўленасць і адабрэнне маладзевай аўдыторыі, сведчаннем чаму сталі гучныя апладысменты. Гарманічна дапоўнілі, разнастаілі змест мерапрыемства музычныя нумары ад юных выканаўцаў песень пра вайну. Матывы вечнай памяці, любові і ўдзячнасці ад нашчадкаў, сямейных сувязяў і пераемнасці пакаленняў сталі ідэйнай асновай літаратурнай праграмы. Адным з найбольш арыгінальных стаў твор Антаніны Нурэтдзінавай – пераклад на беларускую мову верша Расула Гамзатава «Жураўлі». Ірына Васільеўна Фамянкова прэзентавала сваё апавяданне «На всю оставшуюся жизнь», а ў дадатак прадэкламавала некалькі вершаў вядомага дзіцячага паэта Віктара Сямёнавіча Кудлачова, свайго калегі і мужа. Напрыканцы сустрэчы госці ўручылі экзэмпляр кнігі дырэктару гімназіі Вользе Генадзьеўне Хітрушка, а ад гаспадароў атрымалі кветкі і новае запрашэнне – на свята Перамогі.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** прэзентацыя кнігі «Памяці вечны агонь» (2024), зборніка літаратурна-мастацкіх твораў, прысвечаных 80-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гродна, Гімназія № 5 імя У. С. Караткевіча. 28 лютага 2025 года.





Л. А. Кебіч



Дзмітрый Радзівончык



Таццяна Лугавая


МЕЧТА






Ірына Салата




Антаніна Нурэтдзінава






ПОКОЛЕНИЯ
МЕЧТА
УЛЫБКА
РОДИНА


ДОБРОТА
ПОЗИТИВ
УЛЫБКА
БУДУЩЕЕ
МЕЧТА
ДОБРО
ТЕПЛО
ПОЗИТИВ
ЧУДО
РОДИНА
ПОКОЛЕНИЯ






Ірына Фамянкова

Кацярына Каламійцава








**Экзэмпляр зборніка – у падарунак гімназіі**



